1. Ахарактарызуйце прыметы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР у пасляваенны перыяд.
2. Растлумачце, чаму перыяд у грамадска-палітычным жыцці БССР другой паловы 1950-х — першай паловы 1960-х гг. назвалі «адлігай».
3. Чаму ў жыцці беларускай савецкай моладзі вызначальную ролю адыгрываў камсамол?
4. У чым заключалася значэнне рэабілітацыі рэпрэсаваных?

## § 20. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.

***Успомніце.*** **1.** Што такое пяцігодка?
**2.** Што ўяўлялі сабой калектывізацыя сельскай гаспадаркі і раскулачванне?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, якім чынам сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР садзейнічала фарміраванню індустрыяльнага грамадства.

**Пераадоленне наступстваў вайны ў галіне эканомікі. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці.** У выніку ваенных разбурэнняў і злачынстваў германскіх захопнікаў беларускі народ страціў звыш паловы нацыянальнага багацця. Былі спалены і зруйнаваны больш за 200 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, звыш 9 тысяч вёсак. Калі войскі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. вызвалілі Віцебск, у горадзе засталося ўсяго 118 жыхароў, а да вайны іх было не менш як 180 тысяч. Прамысловыя прадпрыемствы і беларуская чыгунка былі амаль поўнасцю знішчаны. Паводле ўспамінаў мінчан, у цэнтральных раёнах горада пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў захаваліся неразбуранымі ўсяго каля 70 будынкаў. У іх ліку — Дом Урада, Дом Чырвонай Арміі, Тэатр оперы і балета, пабудаваныя ў даваенны час па праектах архітэктара І. Лангбарда. Паўставала нават пытанне пра перанос сталіцы БССР у Магілёў.



Мінск. Руіны на плошчы Леніна (цяпер плошча Незалежнасці). 1945 г.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Помнік першаму самазвалу МАЗ-205
каля Мінскага аўтамабільнага завода



Трактар-помнік «Беларусь»
каля Мінскага трактарнага завода

У верасні 1946 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў «Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі на 1946—1950 гг.», які з'яўляўся складнікам агульнасаюзнага плана. Урад СССР выдаткаваў значныя грашовыя сродкі на аднаўленне народнай гаспадаркі Беларусі і дапамогу насельніцтву.

Вызначальным у індустрыяльным развіцці Беларусі стаў курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці. У выніку выканання пяцігодкі быў створаны шэраг новых галін машынабудавання, у тым ліку аўтамабільная і трактарная. У 1947 г. былі выпушчаны першыя аўтамабілі-самазвалы МАЗ-205 на Мінскім аўтамабільным заводзе. Пачаўся серыйны выпуск трактароў на Мінскім трактарным заводзе, а ў 1953 г. з яго галоўнага канвеера сышоў першы колавы трактар «Беларусь».

Прамысловасць рэспублікі (за выключэннем лёгкай і харчовай) ужо ў 1950 г. дасягнула даваеннага ўзроўню па выпуску прадукцыі і пераўзышла яго. У цяжкіх умовах разрухі патрабаваліся не проста рабочыя рукі, а людзі, гатовыя да самаахвярнай адданай працы. Уласцівыя беларускаму народу працавітасць, цярплівасць і сіла волі ў пасляваенныя гады дапаўняліся верай у свае сілы. Праца па аднаўленні народнай гаспадаркі стала гераічным подзвігам беларускага народа.

№ 13

**Развіццё машынабудавання і нафтахімічнай прамысловасці.** У другой палове 1950-х гг. кіраўніцтвам Камуністычнай партыі была пастаўлена задача ў сціслыя тэрміны пераўзысці буйны́я капіталістычныя краіны па вытворчасці найважнейшай прадукцыі на душу насельніцтва. Такой прадукцыяй лічыліся чыгун, сталь, вугаль, нафта, газ, а таксама машыны, станкі, абсталяванне. Першачарговая ўвага надавалася развіццю цяжкай прамысловасці, перш за ўсё машынабудаванне. Выйшлі на поўную магутнасць трактарны і аўтамабільны заводы ў Мінску.

*Папрацуйце са зместам гэтага абзаца, выкарыстоўваючы прыём ключавога слова. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*

Правообладатель Издательский центр БГУ




Помнік стваральнікам самазвалаў каля завода БелАЗ у Жодзіне

У 1958 г. Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіне пачаў выпуск першых самазвалаў БелАЗ.

У 1960 г. упершыню ў СССР у Мінску на заводзе электронных вылічальных машын была зроблена ЭВМ «Мінск-1». У 1962 г. пачаў выпускаць прадукцыю Мінскі завод халадзільнікаў. Быў пабудаваны шэраг новых прамысловых прадпрыемстваў, сярод якіх — Магілёўскі металургічны завод, Мінскі завод аўтаматычных ліній.

Адкрыццё вялікіх запасаў калійных соляў у Салігорскім раёне дазволіла разгарнуць у рэспубліцы шырокамаштабную вытворчасць мінеральных угнаенняў. Былі пабудаваны 1-ы і 2-і Салігорскія калійныя камбінаты, Гомельскі суперфасфатны і Гродзенскі азотна-тукавы заводы. Была атрымана першая прамысловая нафта ў раёне Рэчыцы, але запасы яе аказаліся невялікімі. Таму ўласная нафта забяспечвала патрэбы БССР не больш як на 10 %. Астатняя частка неабходнай нафты, а таксама прыродны газ пастаўляліся з Расіі па трубаправодах, якія праз Беларусь ішлі ў краіны Еўропы. З улікам гэтага ў БССР быў пабудаваны шэраг буйны́х нафтахімічных прадпрыемстваў. Сярод іх — нафтаперапрацоўчы завод і хімічны камбінат у Наваполацку, Светлагорскі завод штучнага валакна. У 1965 г. выпуск прадукцыі хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці ў рэспубліцы павялічыўся ў параўнанні з 1950 г. у 27 разоў.

**Аднаўленне і развіццё сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі.** Сельская гаспадарка Беларусі перажывала глыбокі крызіс, выкліканы ваеннымі разбурэннямі. Сельскагаспадарчая тэхніка была цалкам знішчана. Сеяць калгаснікам, пераважна жанчынам і падлеткам, даводзілася ўручную. Цяглавай сілай былі толькі коні, але іх не хапала, таму вельмі часта і самі людзі запрагаліся ў плугі. У калгаснікаў не існавала моцнага эканамічнага стымулу, бо яны працавалі за працадні. Працадні ўяўлялі сабой адзінку ўліку працы калгаснікаў і размеркавання даходаў па працы ў калгасах у 1930—1966 гг. Выдача калгаснікам збожжа за працадні ў першыя пасляваенныя гады паменшылася. Ім часта прыходзілася жыць за кошт таго, што мелі з агародаў, а гандаль вырашчанымі на прысядзібных участках прадуктамі абмяжоўваўся. Аднак імкненне пераадолець усе цяжкасці і нягоды, а таксама працавітасць нашага народа паспрыялі выкананню планаў першай пасляваеннай пасяўной.

Адначасова з аднаўленнем калгаснай вытворчасці ва ўсходніх абласцях адбывалася калектывізацыя сельскай гаспадаркі заходніх абласцей, уз’яднаных з БССР у 1939 г. Калектывізацыя праводзілася ў сціслыя тэрміны, вельмі часта з выкарыстаннем прымусовых метадаў. Заможныя гаспадаркі былі ліквідаваны. У афіцыйных да-



Правообладатель Издательский центр БГУ

кументах яны называліся кулацкімі. Аднак канкрэтнай прыметы для прылічэння сялянскай гаспадаркі да заможнай, ці «кулацкай», не існавала. Гэтае пытанне вырашалі мясцовыя органы ўлады сумесна з вясковай беднатой. У пачатку 1950-х гг. калектывізацыя ў заходніх абласцях Беларусі амаль што завяршылася. У ходзе яе звыш 10 тыс. заможных сем'яў былі раскулачаны і сасланы ў Сібір і Казахстан.

№ 14

З сярэдзіны 1950-х гг. сельская гаспадарка БССР упершыню за пасляваенныя гады стала прыносіць прыбытак. Некаторыя калгасы ператвараліся ў буйны́я шматгаліновыя гаспадаркі. Сярод іх — калгас «Рассвет» Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці. Яго высокімі дасягненнямі ў галіне сельскагаспадарчай вытворчасці ганарылася ўся краіна. Заслуга ў гэтым належала простым людзям, якія сваёй цяжкай самаадданай працай пасля вайны паднялі калгас з руін і ператварылі яго ў квітнеючую гаспадарку. Кіраваў гэтым калгасам К. П. Арлоўскі.



К. П. Арлоўскі

**Кірыла Пракопавіч Арлоўскі** (1895—1968) нарадзіўся ў вёсцы Мышкавічы Бабруйскага павета (цяпер Кіраўскі раён Магілёўскай вобласці). Герой Савецкага Саюза і Сацыялістычнай Працы. Гэты чалавек-легенда першапачаткова звязваў сваё жыццё з разведкай і служыў у органах дзяржаўнай бяспекі. Удзельнічаў у польска-савецкай вайне 1919—1921 гг., камандаваў партызанскімі атрадамі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Стаў адным з арганізатараў разведвальна-дыверсійнай дзейнасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 1943 г. у баі быў цяжка паранены, яму ампутавалі пілой без наркозу правую руку і пальцы на левай руцэ, да таго ж ён часткова страціў слых. Чалавечыя мужнасць і годнасць давалі моц і жаданне жыць і працаваць на карысць роднай краіны. У сваім лісце да І. В. Сталіна, напісаным пад дыктоўку старэйшай дачкой, К. П. Арлоўскі папрасіў дазволіць яму ўзначаліць адзін з найбольш разбураных калгасаў і паабяцаў адрадзіць яго. У лісце былі такія радкі: «…матэрыяльна я жыву вельмі добра. Маральна — дрэнна. Партыя Леніна — Сталіна выхавала мяне ўпарта працаваць на карысць любімай Радзімы… я глыбока перакананы ў тым, што ў мяне маецца дастаткова фізічных сіл, досведу і ведаў для таго, каб яшчэ прынесці карысць у мірнай працы». У 1944 г. К. П. Арлоўскі быў абраны землякамі старшынёй калгаса «Рассвет» Кіраўскага раёна. Людзі тады яшчэ жылі ў зямлянках, а пасля пачалі перабірацца ва ўласныя дамы. А калі не хапіла сродкаў на будаўніцтва школы, К. П. Арлоўскі зняў для гэтага ўсе грошы са сваёй ашчаднай кніжкі ў банку. Дзякуючы яго намаганням і ўменню арганізаваць калектыўную працу «Рассвет» пад яго кіраўніцтвам стаў першым у СССР калгасам-мільянерам — гаспадаркай, што прыносіла мільённыя прыбыткі.

*1. Што здзівіла вас у лёсе К. П. Арлоўскага і чаму?*
*2. Вызначце, у чым заключалася яго жыццёвая пазіцыя.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Шырокі размах набыла распачатая ў Палессі меліярацыя — асушэнне забалочаных зямель з мэтай прыстасавання зямлі для сельскагаспадарчага выкарыстання і павелічэння пасяўных плошчаў.

№ 15

БССР у шэрагу іншых савецкіх рэспублік зрабіла свой унёсак у асваенне цалінных і абложных зямель Казахстана: туды выехалі дзясяткі тысяч сем'яў з Беларусі. Дзякуючы самаадданай працы цаліннікаў Савецкі Саюз атрымаў істотную прыбаўку збожжа, а асваенне цаліны стала значным гаспадарчым дасягненнем савецкага народа.




Пасведчанне да медаля «За асваенне цалінных зямель»

У пачатку 1960-х гг. адбылося пагаршэнне становішча сельскай гаспадаркі. На яе развіцці адмоўна адбілася пазіцыя тагачаснага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніка СССР М. С. Хрушчова. Пры ім ва ўсіх раёнах БССР, незалежна ад іх прыродна-кліматычных умоў, прымушалі вырошчваць кукурузу. Таксама ў гаспадарках у выніку механізацыі значна скарацілася колькасць коней. Адмоўным было стаўленне кіраўніцтва і да сялянскай падсобнай гаспадаркі, вядзенне якой фактычна забаранялася. Пагаршалася прадуктовае забеспячэнне жыхароў БССР.

**Умовы жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва.** У час вайны вялікая колькасць сем'яў страціла жыллё, людзям прыходзілася жыць нават у зямлянках. За перыяд 1959—1965 гг. у БССР амаль 2,7 млн чалавек палепшылі свае жыллёвыя ўмовы за кошт будоўлі так званых хрушчовак (буйнаблочнага і панэльнага будаўніцтва). У гэтыя гады ў Беларусі з'явіліся новыя добраўпарадкаваныя гарады: Салігорск, Наваполацк, Светлагорск. Такім чынам пачалася ўрбанізацыя — колькасны рост гарадоў і павелічэнне гарадскога насельніцтва.

Значна палепшылася ахова здароўя людзей. У выніку ўзрасла колькасць насельніцтва і стала большай сярэдняя працягласць жыцця. Па выніках Усесаюзнага перапісу 1959 г. насельніцтва БССР налічвала крыху больш за 8 млн чалавек. У сярэдзіне 1960-х гг. працягласць жыцця ў БССР складала ў сярэднім 73 гады і была адной з самых высокіх у свеце (**).

Такім чынам, сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг. сведчыла пра паступовае фарміраванне **індустрыяльнага грамадства**. Для такога тыпу грамадства былі характэрны спецыялізацыя вытворчасці, яе аўтаматызацыя, арыентаванасць на рынак, выкарыстанне ў вытворчасці дасягненняў навукі і тэхнікі, урбанізацыя.

***Новыя паняцці і тэрміны**: індустрыяльнае грамадства.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

** Міністр замежных спраў БССР Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў, які быў урачом па прафесіі, у 1959 г. ад імя БССР выступіў у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый з прапановай стварэння Фонду па садзеянні барацьбе з ракавымі захворваннямі. Па яго ініцыятыве ў Мінску пачалося будаўніцтва анкалагічнага шпіталя. Аднак у сувязі з недахопам сродкаў яно было згорнута. Тады К.В. Кісялёў вырашыў выкарыстаць сваё выступленне ў ААН для таго, каб звярнуць увагу на праблему барацьбы з анкалогіяй. Ён паведаміў пра паспяховае будаўніцтва шпіталя ў Мінску і запрасіў Генеральнага сакратара ААН наведаць рэспубліку з візітам, каб той асабіста мог ацаніць унёсак БССР у агульную справу барацьбы з адным з самых каварных захворванняў чалавецтва. Аднак сваё выступленне К.В. Кісялёў не ўзгадніў з вышэйшым кіраўніцтвам, яно стала вынікам яго асабістай ініцыятывы. Будаўніцтва спецыялізаванага анкалагічнага шпіталя ў Мінску ў сувязі з візітам найвышэйшага прадстаўніка ААН было адноўлена і ў хуткія тэрміны завершана. А К.В. Кісялёва за такія паводзіны знялі з пасады намесніка старшыні Савета Міністраў БССР. Паводле ўспамінаў яго дзяцей, калі бацька, пасля таго як быў пазбаўлены пасады, прыехаў з Масквы дамоў, ён паклікаў іх і сказаў: «Дзеці, пасады прыходзяць і сыходзяць, а бальніцы застаюцца».

*1. Што выклікае ў вас пачуццё павагі да ўчынку К. В. Кісялёва?*
*2. Які сэнс закладзены ў звароце К. В. Кісялёва да дзяцей? Свой адказ растлумачце.*

1. Запоўніце ў сшытку табліцу «Развіццё галін прамысловасці ў БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.».

| Прадпрыемствы машынабудавання | Прадпрыемствы хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці |
|---|---|
| | |

2. Чаму праца па пасляваенным аднаўленні эканомікі БССР стала агульнанародным подзвігам?
3. Чаму першую пасляваенную пасяўную кампанію ажыццявілі пераважна жанчыны і падлеткі?
4. Параўнайце метады правядзення калектывізацыі ў БССР у міжваенны перыяд і ў заходніх абласцях БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны.
5. У чым заключалася павышэнне дабрабыту насельніцтва БССР?
6. Дакажыце, што ў БССР адбываўся працэс фарміравання індустрыяльнага грамадства.

## § 21. Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 1960-х — 1980-я гг.

***Успомніце.*** Што такое «адліга» і рэабілітацыя?

***Вучэбная задача.*** Ахарактарызаваць змены ў грамадска-палітычным жыцці БССР у другой палове 1960-х — 1980-я гг.

**Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі.** У грамадска-палітычным жыцці БССР працягвалася далейшае ўмацаванне ролі

Правообладатель Издательский центр БГУ